# РЭГІЯНАЛЬНЫЯ НАРАТЫВЫ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ XIX СТ.[4]

**П. Р. Кошман**
**МДПУ імя І. П. Шамякіна (Мазыр)**

Станаўленне вобраза Беларусі і напаўненне яго агульным каштоўнасным зместам, значымым для мадэліравання нацыянальнай ідэнтычнасці, характарызуе адно з найважнейшых дасягненняў беларускай літаратуры XIX ст. У творах гэтага перыяду выявіўся працэс канцэптуалізацыі ідэі беларускай адметнасці, звязаны з эвалюцыяй яе ўспрымання ад лакальнага да нацыянальнага маштабаў. Гэтае ўзбуйненне сэнсу адбывалася за кошт узаемадзеяння традыцый успрымання асобных рэгіёнаў, абагульнення ўяўлення аб іх у цэласным вобразе беларускага краю.

Наяўнасць вобраза агульнай радзімы, згодна тэорыі нацыі, адносіцца да ліку абавязковых элементаў нацыянальнай ідэнтычнасці, паколькі дазваляе чалавеку адчуць далучанасць да прасторы, маштабы якой выходзяць за межы яго паўсядзённага існавання. У беларускім выпадку прыклад такога шырокага бачання сваёй прасторы і, адпаведна, канструявання на ім нацыянальнай ідэнтычнасці ілюструе прадмова да паэтычнага зборніка «Дудка беларуская», аўтар якой Ф. Багушэвіч, увасобіўшыся ў вобраз селяніна Мацея Бурачка, палічыў неабходным патлумачыць межы свайго краю. Пры гэтым зварот да чытача, прысутнасць у ім пытанняў і адказаў сведчаць, што на той час не ўсе беларусы, да якіх звяртаўся аўтар, усведамлялі межы сваёй вялікай Радзімы пад назвай Беларусь: «Можа, хто спытае: гдзе цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільні да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў, Вільня

[4] Статья подготовлена при финансовой поддержке МО РБ по договору № 1410/2021 от 22.03.2021.



МГПУ им. И. П. Шамякина

і шмат мястэчкаў і вёсак…» [1, с. 22]. Безумоўна, што для многіх адрасатаў дадзенага тэксту прадстаўленне сваёй уласнай краіны ў такіх геаграфічных, а затым і гістарычных маштабах было па-сапраўднаму адкрыццём. Адсюль і такі тлумачальна-пераканаўчы тон звароту да іх ад імя Мацея Бурачка, такога ж самага селяніна, які пражывае ў ваколіцах Вільні, але які ўжо ўсвядоміў сваё дачыненне да ўсяго народа, якога «не жменька, а з шэсць мільёнаў» [1, с. 21].

Шырокае бачанне Беларусі, той цэласны яе вобраз, які прадставіў Ф. Багушэвіч, з'яўляецца вынікам не толькі палітычных і эканамічных працэсаў, але і творчых. Шлях літаратурнай традыцыі да ўсведамлення радзімы, якое сягала за межы паўсядзённага вопыту, пралягаў праз асэнсаванне рэгіянальных вобразаў, тых тэрыторый, якія мелі свае абрысы, але перш за ўсё адметны гістарычны, прыродны і этнакультурны воблік. Гістарычныя карты выяўляюць на тэрыторыі пражывання беларускага этнасу прысутнасць трох значных рэгіёнаў: Літвы, Беларусі і Палесся. Заканамерна, што разам з картаграфаваннем, візуалізацыяй дадзеных рэгіёнаў існавала і традыцыя напаўнення іх вобразаў тым адметным зместам, які б даказваў правамоцнасць існавання такога рэгіянальнага адасаблення. Адпаведна ў адносінах да названых рэгіёнаў можна казаць аб наяўнасці наратыву – сістэмы аповедаў, якія тлумачаць сэнс вылучэння дадзенай прасторы, працуюць на яе рэпрэзентацыю. Дадзеная напаўняльнасць рэгіянальных традыцый не заставалася па-за ўвагай літаратараў XIX ст. Так, польскі крытык М. Грабоўскі ў 1847 г. адзначаў, што «… вельмі агульным з'яўляецца наданне тутэйшаму асяродку літаратуры і яе зместу катэгорыі літаратуры занёманскай, як прывыклі дзе-нідзе выказвацца. Тутэйшыя краіны складаюцца з трох асобных Намесніцтваў: Літоўскага, Беларускага і таго, які ахоплівае Валынь, Падолле, Украіну… Гэтыя правінцыі – вялікія краі і, несумненна, у сюжэце іх паўсядзённага жыцця ёсць шмат адрозненняў» [2, с. 104–105].

Рэгіянальныя наратывы не былі ізаляваны адзін ад аднаго, больш за тое, іх развіццё прадугледжвала магчымасць абаперціся на параўнанне з іншым і, перш за ўсё, са сваім суседам. Так, значным элементам у канструяванні вобраза Літвы было вылучэнне яе асаблівых гістарычных адносін з Польшчай, а літаратары Беларусі ў сваю чаргу арыентаваліся ўжо на Літву, сцвярджаючы сваё своеасаблівае сваяцтва і пераймаючы элементы вобраза заходняга суседа на сябе.

Такія ж погляды, як у беларускім рэгіянальным наратыве, вылучэнне ідэі сяброўства з суседзямі і супрацоўніцтва агульным ворагам дэманстравалі і прадстаўнікі з творчага асяродку Палесся. У вершы Ф. Савіча «Там блізко Піньска…» галоўны герой паляшук Мікіта заклікаў сваіх суседаў з Валыні і Літвы да яднання ў барацьбе з нацыянальным і сацыяльным уціскам: «Царам на згубу – панам для наукі» [3, с. 130].



МГПУ им. И. П. Шамякина

У сваю чаргу мазырскі паэт С. Неслухоўскі ў паэме «Прыпяіда» паэтызаваў старонкі гераічнага сумеснага змагання сваіх землякоў і ліцвінаў супраць татар.

Аднак у літаратуры XIX ст. можна налічыць усяго некалькі аўтараў, якія, выяўляючы вобраз Палесся, атаясамлівалі сябе з гэтым краем. У асноўным палескі рэгіянальны наратыў фарміраваўся за кошт знешняга асэнсавання, што адбівалася на яго ідэйна-эстэтычным змесце. Пісьменнікі, што належалі да суседніх рэгіёнаў, пры ўспрыманні палескай рэчаіснасці рабілі акцэнт на яе асаблівасцях, на тых адзнаках мясцовасці, якія адрознівалі яе ад іншых. Найбольш запатрабаванымі для выяўлення адметнасці Палесся сталі тэмы прыроды, матэрыяльнага і духоўнага быту палешукоў. Усё гэта пазначалася рысамі экзотыкі, якая была важнай не толькі для выяўлення рэалій палескага краю, але і для ўсведамлення айчыннай літаратурай сваёй самастойнасці. Для творцаў ліцвінскага і беларускага наратываў судакрананне з прыродай і культурай палескага краю стварала сітуацыю пазнання таго іншага свету, якое актуалізавала пытанне ўласнай адметнасці. Расказваючы пра адметнасць такога блізкага і па сутнасці свайго краю, творы палескай тэматыкі Ю. Крашэўскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Лучыны дзяліліся з чытачом адкрыццём таго, наколькі разнастайная іх краіна, паступова ўзбагачалі гэтай палескай унікальнасцю вобраз радзімы.

Рэгіянальныя традыцыі ўплывалі на змест мастацкіх твораў, шмат у чым вызначалі той пункт гледжання, з якога аўтары і іх героі ацэньвалі гістарычныя падзеі, культурныя з'явы, успрымалі навакольны свет. Пры гэтым воблік рэгіёнаў нярэдка арганічна суадносіўся з той агульнай культурнай асновай, якой на той час з'яўлялася польскамоўная культура і рэчпаспалітаўскі патрыятызм. Да прыкладу, А. Міцкевіч, прадстаўляючы ў паэме «Пан Тадэвуш» сваю вялікую радзіму Рэч Паспалітую, зрабіў акцэнт на каштоўнасці кожнага яго рэгіянальнага элемента, а ў баладзе «Тры Будрыса» дэклараваў сяброўства ліцвінаў і палякаў, якія ў мінулым неаднаразова ваявалі, але цяпер цалкам зрадніліся.

Разам з тым, рэгіянальныя наратывы не былі застылымі з'явамі, актыўна развіваліся, рэагуючы на гісторыка-культурныя змены і выяўляючы асабістыя погляды аўтараў. У прыватнасці вобраз Літвы, які на пачатку XIX ст. цесна атаясамліваўся са шляхецкай культурай, паступова напаўняўся актуальнай сацыяльнай праблематыкай. Вершы «Вольнасць сялян у Польшчы» А. Гарэцкага, «Вызваленне сялян» У. Сыракомлі расказваюць пра Літву як краіну, сяляне якой пакутуюць ад жорсткага прыгоннага права. У аўтараў гэтых вершаў антыгуманная сутнасць прыгону выклікала рэзкае непрыманне, якое ў цэлым пераносілася і на вобраз радзімы.

МГПУ им. И. П. Шамякина

Беларускі рэгіянальны наратыў сваім з'яўленнем абавязаны аўтарам з тпаўночна-ўсходняй часткі тэрыторыі беларускага этнасу. Пра значнасць для мясцовых пісьменнікаў беларускай ідэнтычнасці сведчыць шэраг фактаў. У 1837 г. у Пецярбургу ўраджэнцамі тагачаснага Дрысенскага павета быў выдадзены трохтомны зборнік з красамоўнай назвай «Вершаваныя творы трох братоў, Валяр'яна, Клеменса, Юльяна Грымалоўскіх, беларусаў». З 1842 па 1849 гг. дзякуючы ініцыятыве творчай эліты Віцебскай губерні было арганізавана выданне альманаха «Rubon», ініцыятары якога ўсклалі на сябе місію па развіцці культуры ў «наддзвінскай краіне». Указанне на беларускае паходжанне мелі таксама на сваім тытуле знакавыя для гісторыі айчыннай літаратуры тэксты: аповесць «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Я. Баршчэўскага і першы аглядавы артыкул па беларускай літаратуры Р. Падбярэскага «Беларусь і Ян Баршчэўскі». Відавочна, што інтэнсіўнасць прэзентацыі беларускай тэмы з'яўляецца адлюстраваннем упэўненасці аўтараў у каштоўнасці вобраза Беларусі. Менавіта ёй узносіць хвалебныя спевы лірычны герой паэмы «Ваколіцы Віцебска» Т. Лады-Заблоцкага, пераймаючы для краю сваёй маладосці тыя настальгічныя матывы, у якіх крыху раней узнаўляўся вобраз Літвы ў «Пане Тадэвушы» А. Міцкевіча. Гэтае пачуццё абавязку перад радзімай, жаданне падкрэсліць сваю адметнасць пра выяўленне ўнікальнасці роднай зямлі матывуе аўтара распавядаць пра гераічнае мінулае беларускага краю, якое ні ў чым не ўступае суседзям:

Тут беларусін у часы найстарыя
Не раз адбіваў войскаў зграі чужыя.
За край свой спрадвечны, устаўшы сцяною,
Ён біўся адважна тут з Руссю, з Літвою [4, с. 924].

Творчасць Т. Лады-Заблоцкага, ураджэнца Віцебшчыны, сведчыць пра яго беларускую ідэнтычнасць, якая, безумоўна, яшчэ не мела нацыянальнай асновы, але выяўлялася ў асаблівым стаўленні да роднай правінцыі. Т. Лада-Заблоцкі ўводзіць у мастацкую прастору сваіх твораў шэраг знакавых вобразаў беларускай зямлі (рэкі Дзвіна, Віцьба, горад Віцебск), выкарыстоўвае іх паэтычнае апісанне для ўзнёслага прадстаўлення свайго краю. Замацаванню гэтага ўражання спрыяюць аўтарскія каментарыі да паэтычных тэкстаў, дзе ўказваецца на прыналежнасць Беларусі да гісторыі ўсходніх славян і вызначаюцца перспектывы развіцця беларускай літаратуры. Паэт выказваў упэўненасць, што дзякуючы ўвазе мясцовых аўтараў да фальклорнай традыцыі «беларуская паэзія будзе мець сваю ўласцівую адзнаку і здольная будзе абудзіць такую ж цікавасць і прывабнасць, як польская ці літоўская» [5, с. 150].

Паэт меў рацыю ў ацэнцы перспектыў беларускай літаратуры. З пазіцый сённяшняга дня відаць, што апетая ім рэгіянальная Беларусь



МГПУ им. И.П. Шамякина

на працягу XIX ст. набірала моц прыцяжэння, станавілася ядром нацыянальнага мастацтва слова і нацыянальнага светаўспрымання. У гэтым працэсе суседнія рэгіянальныя наратывы выконвалі ўжо дапаможную ролю. Ліцвінскі стаў тым фундаментам, на якім выбудоўвалася гістарычная канструкцыя вобраза нацыянальнага свету, а палескія тэксты высвечвалі яго прыродную і культурную унікальнасць.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф. Багушэвіч ; уклад. і прадм. Я. Янушкевіча ; камент. У. Содаля, Я. Янушкевіча. – 2-е выд. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2001. – 206 с.

2. Мархель, У. Прадвесце: Беларуска-польскае літаратурнае ўзаемадзеянне ў першай палавіне XIX ст. / У. Мархель. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 112 с.

3. Савіч, Ф. Там блізько Піньска… / Ф. Савіч // Шляхам гадоў : гіст.-літ. зб. ; уклад. Я. Янушкевіч. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1994. – С. 129–130.

4. Лада-Заблоцкі, Т. Ваколіцы Віцебска / Т. Лада-Заблоцкі // Літаратура першай паловы XIX стагоддзя ; укладанне і каментарыі М. В. Хаўстовіча ; навук. рэд. С. Л. Гаранін. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. – С. 923–928.

5. Łada-Zabłocki, T. Zaklęta dziewica (ballada). Z podania gminnego / T. Łada-Zabłocki // Rubon. – 1847. – T. VII. – S. 143–150.

МГПУ им. И. П. Шамякина